естествознания Беларуси, во-первых, позволило бы объединить усилия специалистов академических институтов и библиотек, во-вторых, такое издание было бы лучшей репрезентацией интеллектуальной культуры Беларуси.

*Рассматриваются проблемы историко-философских исследований памятников книжной культуры Беларуси XVIII–XIX вв., составляющих теоретический корпус физиократизма, или течения философствующих экономистов, которое доминировало в интеллектуальной жизни белорусского и литовского регионов в данный период. Материалы первоисточников физиократизма находятся в библиотечных фондах Беларуси, Литвы, Польши и рассматриваются как важная составная часть интеллектуального наследия Беларуси и Европы, отражают общие тенденции развития европейской социальной философии эпохи Просвещения, становление социально-правовой теории, социально-экономической теории, антропологии.*

*The report is devoted to the problems of historical and philosophical studies of book-monuments of Belarus XVIII–XIX centuries, which are included in theoretical Corps of Physiocracy. Physiocracy was dominate intellectual trend in the Belarusian and Lithuanian regions in the period. Primary source materials are in the libraries of Belarus, Lithuania, Poland, and regarded as an important part of the intellectual heritage about European social philosophy, socio-economics, anthropology.*

**Коваль В.У.** *(Мінск)*

## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ

Фарміраванне беларускай дыяспары пачынаецца ў міжваенны перыяд, калі ў заходніх краінах ідзе стварэнне першых беларускіх асяродкаў, палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Менавіта палітычнай актыўнасцю замежжа можна патлумачыць з'яўленне перыядычнага друку беларускай эміграцыі ў міжваенны час. Газеты і часопісы беларускага замежжа сталі каштоўнымі гістарычнымі крыніцамі для сучасных даследчыкаў, аднак праблема іх захавання

хвалюе не толькі спецыялістаў, але і прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі.

Прэса беларускай эміграцыі міжваеннага часу – дастаткова рэдкія выданні, частка якіх не захавалася ні ў замежных, ні ў беларускіх бібліятэках і архівах. Адсутнасць некаторых перыядычных выданняў тлумачыцца не толькі слабай распаўсюджанасцю прэсы, але і тым фактам, што чытачы далёка не заўсёды захоўвалі беларускія газеты і часопісы ў сваіх прыватных калекцыях. Пра шэраг перыядычных выданняў інфармацыю можна знайсці толькі ва ўспамінах эмігрантаў ці ў бібліяграфічных даведніках.

Найбольш багатая калекцыя эміграцкай прэсы пэўны час захоўвалася ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, дзе збор сістэматычна дапаўняўся газетамі і часопісамі з бібліятэк і архіваў ЗША, Аўстраліі, Германіі, Вялікабрытаніі і іншых краін свету. Плённую навуковую працу з перыёдыкай праводзілі супрацоўнікі ўзгаданай установы. Першым кіраўніком навукова-асветнага цэнтра быў прафесар Адам Восіпавіч Мальдзіс, які падтрымліваў сталыя сувязі з прадстаўнікамі беларускай дыяспары, што дазваляла яму пашыраць калекцыю прэсы. Пад кіраўніцтвам прафесара навуковыя супрацоўнікі пачалі класіфікацыю перыёдыкі замежжа, яны рабілі першыя спробы па выпрацоўцы метадаў даследавання дадзеных масавых гістарычных крыніц. Наступнае кіраўніцтва цэнтра не надавала адпаведнай увагі газетам і часопісам беларускіх эмігрантаў, таму частка нумароў з рэдкай калекцыі была проста згублена.

Па прычыне рэарганізацыі і ліквідацыі цэнтра ўвесь збор перыёдыкі быў перададзены ў Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка. На вялікі жаль, на некалькі гадоў дадзеныя выданні фактычна сталі недаступнымі для беларускіх гісторыкаў, што выклікала бурную грамадскую палеміку. Пра каштоўнасць бібліятэкі і музея былога цэнтра пісаў сам А.В. Мальдзіс, пытанне перадачы калекцыі прэсы дыяспары ўздымалася таксама ў навуковых працах беларускіх аўтараў [2]. Па выніках абмеркавання праблемы спецыялісты з музейных і бібліятэчных фондаў найбольш каштоўныя рэчы, кнігі і перыядычныя выданні цэнтра забралі ў нацыянальныя сховішчы.

Асноўная частка перыёдыкі беларускага замежжа патрапіла ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Безумоўна, дадзеныя газеты і часопісы патрабавалі спецыяльных умоў захавання, большасць з іх літаральна рассыпалася ў руках пры неасцярожных дотыках чытачоў.

Фактычна перадача эмігранцкай прэсы ў Нацыянальную бібліятэку спыніла яе знішчэнне. Разам з тым выданні міжваеннага і ваеннага часу, а таксама газеты і часопісы першых пасляваенных дзесяцігоддзяў павінны выкарыстоўвацца на электронных носьбітах, што дазволіць ўратаваць арыгіналы ад разбурэння.

Перыядычныя выданні беларускай дыяспары захоўваюцца не толькі ў айчынных бібліятэках і архівах, але і ў Беларускай бібліятэцы імя Францыска Скарыны ў Лондане, у калекцыях прэсы Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкі, Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы і г. д. Замежныя зборы аб'ядноўваюць шматлікія нумары газет і часопісаў дыяспары, якія паўтараюцца і ў беларускіх бібліятэках, таму айчынныя калекцыі можна лічыць дастатковымі для рэпрэзентатыўнага даследавання замежжа.

Нягледзячы на фіксацыю назваў перыядычных выданняў у сучасных бібліяграфічных даведніках, значная частка прэсы не захавалася нават у замежных калекцыях. Пра нумары асобных выданняў толькі ўзгадваецца ў бібліяграфічных даведніках замежных гісторыкаў, у прыватнасці ў рабоце Вітаўта і Зоры Кіпель «Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе: часапісы, газэты» [1]. Гэтая бібліяграфія складзена ў першую чаргу паводле эміграцкай прэсы, якая захоўваецца ў Нью-Йоркскай публічнай бібліятэцы, Беларускай бібліятэцы імя Францыска Скарыны ў Лондане, Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы, замежных сховішчах і інш. Даследчыкі прыводзяць дастаткова шырокі спіс перыядычных выданняў, аднак ён усё ж няпоўны. Выдадзеныя невялікімі тыражамі газеты і часопісы не заўсёды ўяўлялі каштоўнасць для прадстаўнікоў беларускай эміграцыі, таму частка іх з цягам часу была проста згублена і страчана.

Важным бібліяграфічным выданнем з'яўляецца кніга Ежы і Янiны Трачук «Анатаваная бібліяграфія беларускіх часопісаў, выдадзеных у 1918–1939 гг. у Заходняй Беларусі і на эміграцыі» (на польскай мове) [3, с. 252–373]. Каштоўнасць дадзенага даведніка заключаецца ў кароткай характарыстыцы асноўнай тэматыкі прэсы беларускіх эмігрантаў. Некаторыя газеты і часопісы сёння не захаваліся, а аўтары зрабілі апісанне асаблівасцей перыядычных выданняў на старонках свайго даведніка, пералічылі асноўныя тэматычныя кірункі і найбольш актыўных карэспандэнтаў. Анатацыі незахаваных выданняў дазваляюць зрабіць выснову пра рубрыкі прэсы, яе ўплыў на чытачоў.

Пры выкарыстанні перыядычных эміграцыйных выданняў даследчыку неабходна правесці сур'ёзную аналітычную работу па

выяўленні матываў аўтараў, іх палітычных перакананняў і пазіцый. З прэсы можна атрымаць фактычны матэрыял пра дзейнасць прадстаўнікоў беларускай і украінскай эміграцыі, напрыклад звесткі аб праведзеных агульных мерапрыемствах, сустрэчах і вечарынах. Аднак даследчыку неабходна памятаць, што прэса публікавала суб'ектыўныя меркаванні пэўных грамадскіх арганізацый. Часта агрэсіўная крытыка на старонках газет і часопісаў з'яўлялася палітычнай замовай, таму можна падкрэсліць суб'ектыўны і аднабаковы характар прэсы як гістарычнай крыніцы. Пры вывучэнні перыёдыкі ад гісторыка патрабуецца выкарыстанне сістэмнага падыходу, бо заўсёды неабходна памятаць пра асабістыя погляды аўтараў артыкулаў, іх палітычныя перакананні і пазіцыі. Крытычны падыход пры даследаванні прэсы дазволіць пазбегнуць памылковых высноў і скажэнняў фактаў.

Асабліва важна выпрацаваць спецыяльны навуковы падыход пры рабоце з перыядычнымі выданнямі Другой сусветнай вайны і часу халоднай вайны, бо ацэнка ролі беларускіх калабарантаў да сённяшняга дня застаецца тэмай для вострай палемікі айчынных гісторыкаў.

Даследаванне газет і часопісаў перыяду Другой сусветнай вайны дае магчымасць вывучыць ідэалагічныя ўстаноўкі нацыстаў і іх дзейнасць па фарміраванні палітычных стэрэатыпаў для ўплыву на масавую свядомасць беларусаў. Прапаганда была важным складальнікам таго акупацыйнага рэжыму, без уліку якога меркаванні наконт нямецкай акупацыі і даследаванні дзейнасці пасляваеннай беларускай эміграцыі будуць аднабаковымі і няпоўнымі. Пасляваенная эмігранцкая перыёдыка ў часы халоднай вайны таксама адыгрывала ролю палітычнай прапаганды. Пры гэтым выкарыстоўваўся вопыт, здабыты пры нацыстах. Пераемнасць метадаў агітацыі і прапаганды з часоў вайны дазваляла шырока асвятляць выдаўцам перыядычных выданняў тэму антысаветызму.

На сённяшні дзень вядзецца актыўнае даследаванне мінулага беларускай эміграцыі, яе міжнацыянальных сувязей, культурнай і палітычнай спадчыны. Матэрыялы з прэсы беларускага замежжа яшчэ патрабуюць сваіх спецыялістаў, бо далёка не ўсе кірункі тэматыкі друку вывучаныя і распрацаваныя. Газеты і часопісы беларускіх эмігрантаў захоўваюцца ў выглядзе арыгіналаў, ксеракопій, мікрафільмаў і мікрафішаў у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларус-

кім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, бібліят[...] Музея беларускага кнігадрукарства ў Полацку, Беларускім дзяржа[...] нымі архіве-музеі літаратуры і мастацтва, прыватных калекцыя[...] Ступень захаванасці перыёдыкі нездавальняючая. Большасць выда[...] няў механічна папсавана, папера некаторых нумароў ужо рассып[...] ецца пры неасцярожных дотыках чытачоў.

Актуальнасць дадзенай тэмы прымушае падняць пытанне па фарміраванні асноўнай калекцыі перыёдыкі беларускай дыяспары ў нацыянальным сховішчы рэспублікі. Існуе патрэба ў адным месц[...] сабраць газеты і часопісы замежжа з бібліятэк і архіваў Рэспублікі Беларусь, а таксама некаторыя нумары з замежных сховішчаў. Безу[...] моўна, рэдкія выданні (якія захаваліся ў адзіным экземпляры) могуць быць перададзеныя ў электронным выглядзе, што дазволіць абыйсці шэраг маральных і прававых перашкод. Менавіта такі максімальн[...] поўны збор эміграцкай перыёдыкі пачне стымуляваць сучасных гісторыкаў, спецыялістаў у галіне крыніцазнаўства, да распрацоўкі методыкі вывучэння прэсы дыяспары. Калекцыя перыёдыкі стане цудоўнай ілюстрацыяй палітычнай, эканамічнай і культурнай спад[...] чыны беларускіх эмігрантаў.

Такім чынам, прэса беларускай дыяспары з'яўляецца каштоўнай гістарычнай крыніцай, на захаванне і збіранне якой неабходна звяр[...] нуць увагу навуковых колаў і грамадскасці. Выкарыстанне інфарма[...] цыі з газет і часопісаў эмігрантаў патрабуе дэталёвага аналізу, асаб[...] ліва пры даследаванні перыёдыкі беларускіх калабарантаў. Айчын[...] ныя крыніцазнаўцы праводзяць работу па вылучэнні спецыфічных метадаў класіфікацыі і сістэматызацыі эміграцкай прэсы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Кіпель, В.** Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе : часопісы, газэты / В. Кіпель, З. Кіпель. – Нью-Йорк : Беларускі інстытут навукі і мас[...] тацтва, 2004. – 150 с.

2. **Коваль, В. У.** Перыядычныя выданні беларускай дыяспары як гіста[...] рычная крыніца (1939–1960 гг.) / В. У. Коваль. – Мінск : РІВШ, 2008. – 166 с.

3. **Traczuk, J.** Adnotowana bibliografia czasopism białoruskich lat 1918–1939 ukazujących się na Białorusi Zachodniej I emigracji / J. Traczuk, J. Traczuk. – [Б. м., б. г.].

*В статье рассмотрены наиболее известные коллекции периоди[...] ческих изданий белорусской диаспоры, проблемы их сохранения*

*и систематизации. Обозначены сложности восприятия информации со страниц газет и журналов зарубежья, обоснована необходимость в детальном источниковедческом анализе специалистами. Вынесено предложение о формировании наиболее полного собрания периодических изданий диаспоры, куда войдут номера прессы из белорусских и зарубежных библиотек и архивов.*

*The research is based on materials of newspapers and magazines of Belarusian emigration. Special attention is given to the formation of the Belarusian collection of periodicals. The article analyzes such questions as the role of emigrants and their press in the history of Belarus, the thematic classification and ideological tendency of the newspapers and magazines.*

***Колупаев В.Е.** (Сериате)*

## РАБОТЫ БЕЛОРУССКОГО ПОЛИТИКА НАДЕЖДЫ ТЕОДОРОВИЧ В ДОКУМЕНТАЛЬНОМ СОБРАНИИ ИТАЛЬЯНСКОГО ЦЕНТРА «RUSSIA CRISTIANA»

Надежда Александровна Теодорович, в девичестве Абрамова, (бел. Надзея Абрамава) (1907–1979), известна в исторической науке как политолог и деятель эмиграции. В послевоенный период своей жизни, проживая в Западной Германии, она работала научным сотрудником Института по изучению истории и культуры СССР, специализируясь как религиовед и документалист. Институт был создан в 1950 г. в Мюнхене представителями второй волны русской эмиграции, финансировался из США. Цели созданного института заключались в следующем: «исследовать теорию и практику государственного и социального порядка в СССР, а также различных исторических, культурных, социальных, экономических, национальных и политических проблем народов СССР; наладить и поддерживать научные связи с немецкими и иностранными научными организациями и отдельными учеными» [1]. В 1972 г. институт был закрыт в рамках Хельсинских (1969) и Вашингтонских (1971–1972) соглаше-